# СОЙМАВАЯ РЭФОРМА 1764 ГОДА ЯК ВАЖНЫ ЭТАП У ГІСТОРЫІ ПАРЛАМЕНТАРЫЗМУ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

***А. В. Валеўка***

Полацкі дзяржаўны універсітэт,
г. Полацк, Рэспубліка Беларусь

Автор рассматривает историю развития представительных институтов власти на белорусских землях, в частности в XVIII веке. Делаются выводы о том, что сеймовая реформа 1764 года в Речи Посполитой стала новым этапом в процессе развития парламентаризма на белорусских землях, так как вводились принципиально новые положения, которые должны были преодолеть устаревшие институты власти.

Аўтар разглядае гісторыю развіцця прадстаўнічых інстытутаў улады на беларускіх землях, у прыватнасці ў XVIII стагоддзі. Робяцца высновы аб тым, што соймавая рэформа 1764 года у Рэчы Паспалітай стала новым этапам у працэсе развіцця парламентарызму на беларускіх землях, бо ўводзіліся прынцыпова новыя палажэнні, якія павінны былі пераадолець састарэлыя інстытуты ўлады.

Author considers the history of the development of representative institutions of power in the Belarusian lands in the XVIII century. It is concluded that the 1764 Diet reform in the Polish-Lithuanian Commonwealth became a new stage in the process of development of parliamentarism on the Belarusian lands, since fundamentally new provisions were introduced that the outdated institutions of power had to overcome.

***Ключевые слова:*** соймавая реформа 1764 года на белорусских землях; парламентаризм.

***Ключавыя словы:*** соймавая рэформа 1764 года на беларускіх землях; парламентарызм.

***Keywords:*** reform of 1764 in the Belarusian lands; the parliamentary system.

Прадстаўнічыя інстытуты ўлады на беларускіх землях маюць доўгую і багатую гісторыю. На працягу нашай шматвяковай гісторыі існавалі розныя формы прадстаўніцтва: веча, капа, сойм. Кожны з гістарычных перыядаў мае свае асаблівасці. Адным з самых цікавых этапаў у кантэксце развіцця праламентарызму і прадстаўніцтва з'яўляецца XVIII стагоддзе.

Я.А. Юхо адзначаў, што ў першай палове XVIII стагоддзя разгарнулася барацьба паміж прагрэсіўным колам шляхты, якія

выступалі за шырокія рэформы, і рэакцыйнай магнатэрыяй, якая імкнулася да захавання састарэлага ладу Рэчы Паспалітай [3, с. 283]. Адным з найважнейшых кірункаў рэфармавання павінна была стаць рэформа соймавай сістэмы.

Упершыню ідэю аб неабходнасці пераўтварэнняў парадку правядзення соймікаў выказаў яшчэ ў часы Аўгуста III Ф. Раджэўскі – падкаморы познаньскі [2, с. 189]. Пазней праграма змен у сістэме соймавання была сфармулявана ў працы С. Канарскага “O skutecznym rad sposobie albo o utrzymywaniu ordynaryinych seymów” [4]. Часткова ідэі С. Канарскага былі запазычаны партыяй Чартарыйскіх у іх праграме рэфармавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай.

Магчымасць ажыццяўлення рэформ у Рэчы Паспалітай з’явілася падчас правядзення Канвакацыйнага сойма 1764 года. Падчас працы сойма было прынята больш за 180 пастановаў. Адной з самых значных была канстытуцыя “O porzadku sejmowania” [6].

У пастанове «Аб парадку соймавання» быў замацаваны новы рэгламент працы сойма. Так, каб падоўжыць час пасяджэнняў, была прынята працэдура працягу пасяджэнняў «пры свечках», што раней забаранялася [6, с.17]. Для вырашэння такіх пытанняў, як падаткі, пошліны і іншыя эканамічныя «матэрыялы», было прынята рашэнне аб галасаванні большасцю [6, с.18]. Такім чынам, права «liberum veto» было часткова абмежавана ў фінансавай сферы. А прынятая напачатку сойма пастанова аб утварэнні генеральнай канфедэрацыі ўвогуле павінна была на некалькі гадоў заблакіраваць яго ўжыванне [5, l.75]. Яшчэ адна пастанова вызваляла паслоў ад сляпога падпарадкавання "інструкцыям", перадсоймавым наказам ваяводскай і павятовай шляхты [1, с. 217]. Тым самым, ім надавалася права самастойна прымаць рашэнні пры разглядзе важнейшых пытанняў унутранай і знешняй палітыкі дзяржавы, што раней было немагчыма з-за патрабавання літаральна прытрымлівацца наказаў, якія былі прыняты на павятовым сойміку

Сойм павялічыў лік дэпутацкіх соймікаў, што было звязана з павелічэннем колькасці дэпутатаў трыбуналаў, узрасла і колькасць гаспадарскіх (гаспадарчых) соймікаў [1, с.218] . Тым самым пашыраўся ўдзел шляхты ў земскім самакіраванні. Гаварылася на сойме і аб рэформе пасольскіх соймікаў. Для іх таксама, як і для дэпутацкіх соймікаў прадугледжваўся парадак абрання паслоў на сойм і зацвярджэнне ім інструкцый большасцю галасоў і адхіленне неаседлай і беззямельнай шляхты ад удзелу ў выбарах [1, с.218].

Пастанова аб галасаванні большасцю на дэпутацкіх сойміках і пры абранні службовых асоб змяшчалася ў канстытуцыі аб рэарганізацыі

кароннага трыбунала, а аналагічнае правіла для пасольскіх соймікаў, нароўні з дапушчэннем да выбараў толькі аселага шляхты, было складзена ў канстытуцыі, якая фармальна адносілася толькі да соймікаў Брацлаўскага ваяводства, што пазней меркавалася распаўсюдзіць на ўсе соймікі Рэчы Паспалітай [7, с.30].

Такім чынам, соймавая рэформа 1764 года ў Рэчы Паспалітай стала новым этапам у працэсе развіцця парламентарызму на нашых землях, бо ўводзіліся прынцыпова новыя палажэнні, якія павінны былі пераадолець састарэлыя інстытуты ўлады, не адпявядаючыя патрабаванням таго часу. Аднак рэформа не атрымала поўнага ажыццяўлення.

### Бібліяграфічныя ссылкі

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск: Экаперспектыва, 2007. Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стагоддзе) / Ю. Бохан [і інш.]. 2007. 344 с.

2. Носов Б.В. Установление российского господства в Речи Посполитой. 1756 – 1768 гг. / Отв. ред. В.К. Волков. М.: Индрик, 2004. 728 с.

3. Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. дапам : у 2 ч. Мінск : РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1. 352 с.

4. Konarski S. O skutecznym rad sposobie i inne pisma polityczne / Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich. Wydawnictwo ; Warszawa : we swpółpr. z De Agostini Polska, cop. 2005. 347 l.

5. Korzon Tadeusz Wewnetrzne dzieje Polski za Stanislawa Augusta (1764 – 1794) badania historyczne ze stanowiska ekonomicznego i administracyjnego T.3. Kraków : Księgarnia L. Zwolińskiego i S-ki ; Warszawa : nakł. Księgarni Teodora Paprockiego i S-ki, 1897. 491 s.

6. O porzadky seymowania / Volumina legum. Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. T. VII. L. 17-18.

7. Rozdzielenie Trybunalow Koronnych / Volumina legum. Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. T. VII. L. 30-33.

## АБ ПРАБЛЕМАХ ЦЭНТРАЛІЗАЦЫІ ЎЛАДЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ І КАРОНЕ ПОЛЬСКАЙ

***В. М. Бічун***

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

У артыкуле разглядаюцца тэндэнцыі, якія перашкаджалі цэнтралізацыі ўлады Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага.

В статье рассматриваются тенденции, которые препятствовали централизации власти Польши и Великого Княжества Литовского.